# ГІСТОРЫЯ

УДК 908(476) DOI 10.63874/2218-0281-2025-2-5-20

***Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф.,*
*праф. каф. гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Vabishchevich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor,*
*Professor of the Department of History of Belarus and Special Historical Disciplines*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: vabischev@rambler.ru

## КРАЯЗНАЎСТВА Ў БРЭСЦКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ А. С. ПУШКІНА: ДАСЯГНЕННІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ (ДА 80-ГОДДЗЯ ВНУ)

*У артыкуле абагульнены і сістэматызаваны звесткі аб краязнаўчых даследаваннях (па асноўных напрамках – літаратурным, гістарычным, геаграфічным і экалагічным краязнаўстве) у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна ў 1945–2025 гг., а таксама аб выкарыстанні краязнаўства ў адукацыйным працэсе. Паказаны ўклад навукова-педагагічных школ, прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта ў станаўленне і развіццё краязнаўства, вызначаны яго актуальныя і перспектыўныя пытанні.*

***Ключавыя словы:*** *Брэсцкі ўніверсітэт, краязнаўства, літаратурнае краязнаўства, гістарычнае краязнаўства, геаграфічнае і экалагічнае краязнаўства, універсітэтазнаўства.*

### *Local Study at Brest State A. S. Pushkin University: Achievements and Prospects (to the 80th Anniversary of the University)*

*The article summarizes and systematizes information on local study research (in the main areas – literary, historical, geographical and ecological local study) at Brest State University named after A. S. Pushkin in 1945–2025, as well as on the use of local study in the educational process. The contribution of scientific and pedagogical schools and university professors to the formation and development of local study is shown, and its current and promising issues are identified.*

***Key words:*** *Brest University, local study, literary local study, historical local study, geographical and ecological local study, university studies.*

### Уводзіны

Паводле энцыклапедычнай і даведачнай літаратуры, краязнаўства – гэта комплекснае міждысцыплінарнае даследаванне асобнага рэгіёна ці населенага пункта мясцовым насельніцтвам, вучонымі з адлюстраваннем іх геаграфічных, культурна-гістарычных, этнаграфічных, эканамічных асаблівасцей, а таксама папулярызацыя вынікаў гэтага вывучэння [1, с. 257; 2, с. 375].

У Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна за 80 гадоў яго дзейнасці праведзены маштабныя па аб’ёму даследаванні розных сфер жыццядзейнасці Брэсцкай вобласці, яе раёнаў, гарадоў і вёсак, прадпрыемстваў, установ арганізацый, насельніцтва. Назапашаны і перададзены спецыялістам, выпускнікам універсітэта велізарны вопыт прымянення краязнаўства ў навучанні і выхаванні студэнтаў, школьнікаў, працоўнай моладзі.

Гісторыя ВНУ (Брэсцкага настаўніцкага інстытута, Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна, а цяпер Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна) ужо з’ўлялася прадметам шматлікіх даследаванняў. Сярод вынікаў найбольш значных з іх трэба адзначыць пераважна юбілейныя манаграфіі, зборнікі матэрыялаў канферэнцый, даведачныя выданні, бібліяграфічныя і біябібліяграфічныя даведнікі, артыкулы ў навуковых часопісах, інтэрв’ю [3–10]. Аднак там краязнаўства асобна не адлюстравана, паказана фрагментарна і толькі ў кантэксце агульнай дзейнасці ВНУ, яе структурных адзінак, прафесарска-выкладчыцкага складу.

Асобныя звесткі аб краязнаўстве ў БрДУ імя А. С. Пушкіна прыведзены ў аглядзе развіцця краязнаўства ва ўніверсітэтах Беларусі [11, с. 189–191] (адзінкавыя і памылковыя), у Брэсце [12]. Аўтарам гэтага артыкула таксама вывучаліся асобныя аспекты краязнаўства ва ўніверсітэце [13–15]. Аднак комплекснага вывучэння гэтай праблематыкі пакуль не было.

Менавіта таму мэтай гэтага артыкула з'яўляецца абагульненне і сістэматызацыя звестак аб краязнаўчых даследаваннях, прымяненні краязнаўства ў адукацыйным працэсе Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна ў 1945–2025 гг.

Для яе выканання паспрабуем выканаць наступныя задачы:

1) раскрыць асноўныя напрамкі краязнаўства;

2) выявіць уклад у краязнаўства прафесарска-выкладчыцкага складу;

3) адлюстраваць прымяненне краязнаўства ў адукацыйным працэсе;

4) вызначыць перспектыўную праблематыку краязнаўчых даследаванняў і краязнаўчай працы.

**Літаратурнае краязнаўства**

З самага пачатку дзейнасці ў Брэсце настаўніцкага інстытута, а потым педагагічнага інстытута яго выкладчыкі пачалі займацца вывучэннем культуры, літаратуры Брэстчыны і яе рэгіёнаў. У другой палове 1940-х – 1950-я гг. з'явіліся ў перыёдыцы і навуковым друку краязнаўчыя публікацыі загадчыкаў аддзяленняў (гісторыка-філалагічнага, беларускай і рускай моў і літаратур) М. Г. Дуброўскага, А. С. Барысаўца, Л. А. Царанкова, І. І. Зянько (абараніў кандыдацкую дысертацыю аб гаворках Пружаншчыны [16]).

Пэўны ўклад у развіццё краязнаўства ўнеслі навукова-педагагічныя школы філалагічнага факультэта, што сфарміраваліся яшчэ ў папярэднія дзесяцігоддзі: літаратуразнаўчая (заснавальнік – прафесар У. А. Калеснік, прафесар М. І. Мішчанчук), літаратурна-метадычная (прафесар В. Я. Зарэцкая (Ляшук), цяпер прафесар З. П. Мельнікава), лінгваметадычная (прафесар Г. М. Малажай), лінгвадыдактычная (дацэнт М. М. Аляхновіч).

Традыцыі літаратурнага краязнаўства былі закладзены ў 1950–1980-я гг. У. А. Калеснікам – вядомым пісьменнікам і літаратуразнаўцам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа. У 1954–1994 гг. ён быў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры, прафесарам кафедры беларускага літаратуразнаўства. У. А. Калеснік звярнуўся «да такога надзейнага і выпрабаванага сродку патрыятычнага выхавання, якім з'яўляецца краязнаўства… распрацаваў маршрут і вадзіў па ім студэнтаў аж да канца 70-х гг… ахопліваў найбольш знакамітыя літаратурныя мясціны і помнікі дойлідства» [17]. Па яго ініцыятыве былі створаны літаратурна-краязнаўчыя стэнды «Яны надрукаваліся», «Пісьменнікі – госці Брэстчыны», «Шляхамі паэтаў і герояў», «Рускія пісьменнікі на Брэстчыне» і інш. Адным з напрамкаў літаратурна-краязнаўчай працы было абмеркаванне кніг пісьменнікаў з удзелам іх аўтараў. У. А. Калеснік выступаў з ідэяй стварэння літаратурна-краязнаўчай карты Брэсцкай вобласці.

Значны ўклад ва ўніверсітэцкае і школьнае літаратурнае краязнаўства ўнесла член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі В. Я. Зарэцкая (Ляшук), аўтар шматлікіх прац па методыцы выкладання беларускай літаратуры, дапаможнікаў для ВНУ, школьных падручнікаў. Яе кандыдацкая дысертацыя была прысвечана краязнаўству як сродку павышэння эфектыўнасці навучання і выхавання [18]. Ва ўсёй рэспубліцы актыўна выкарыстоўваўся падручнік В. Я. Зарэцкай (Ляшук) па методыцы літаратурнага краязнаўства ў школе [19]. У 1989–1994 гг. яна ўзначальвала кафедру беларускага літаратуразнаўства, а ў 1994–2004 гг. – кафедру методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства, у 2004–2007 гг. з'яўлялася прафесарам гэтай кафедры. У 2004–2009 гг. кафедру методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства ўзначальваў дацэнт У. А. Сенькавец. У выніку структурных пераўтварэнняў у 2009 г. гэтая кафедра была далучана да кафедры беларускага літаратуразнаўства.

Сумеснымі намаганнямі вучоных-літаратуразнаўцаў універсітэта былі выдадзены кнігі пра літаратуру Берасцейшчыны, распрацавана літаратурная карта [20–22]. На філалагічным факультэце прафесарамі М. І. Мішчанчуком, А. А. Майсейчыкам, дацэнтамі Г. М. Праневічам, І. І. Калянковічам і іншымі аўтарамі былі падрыхтаваны шматлікія гісторыка-літаратурныя працы.

Мовазнаўчымі даследаваннямі, вывучэннем дыялектаў актыўна займаліся прафесар Г. М. Малажай, дацэнты М. М. Аляхновіч, Л. В. Леванцэвіч і інш. Быў падрыхтаваны вучэбна-метадычны дапаможнік «Лінгвакраязнаўства» (Брэст, 2006).

Пытаннямі літаратурнага краязнаўства займалася заслужаны настаўнік Беларусі, дацэнт М. П. Жыгалава, якая абараніла кандыдацкую дысертацыю аб літаратурным краязнаўстве пры вывучэнні славянскіх пісьменнікаў школьнікамі IX–X класаў [23].

У апошнія дзесяцігоддзі традыцыі літаратурнага краязнаўства на філалагічным факультэце працягвалі прафесар З. П. Мельнікава, дацэнты У. А. Сенькавец, С. Р. Рачэўскі і інш. Гісторыяй рэгіянальных СМІ займаюцца дацэнты В. М. Смаль, С С. Клундук. Былі арганізаваны першая гарадская навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных і навучэнцаў «Мая Радзіма – Беларусь!» (2006), рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ» (2008), рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў «Берасцейскія карані: гісторыя, літаратура, культура краю і сучаснасць» (2024), прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і інш.

Пад кіраўніцтвам прафесара З. П. Мельнікавай былі падрыхтаваны падручнікі для 11-гадовай агульнаадукацыйнай школы, метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў. З 2009 г. у сярэдніх школах Рэспублікі Беларусь выкарыстоўваліся падручнікі «Беларуская літаратура» (10 клас) і «Беларуская літаратура» (11 клас), падрыхтаваныя пад яе кіраўніцтвам выкладчыкамі кафедры беларускага літаратуразнаўства. Краязнаўчы вучэбны кампанент займаў там належнае месца.

Сярод шэрага напрамкаў фундаментальных даследаванняў, якія выконваліся на філалагічным факультэце, трэба адзначыць лінгвістычнае краязнаўства. У прыватнасці, праводзілася комплекснае вывучэнне намінатыўных адзінак дыялектнай і літаратурнай мовы пісьменнікаў Брэстчыны, у ходзе якога выяўлены спецыфічныя асаблівасці онімаў, даследавана нацыянальна-культурная семантыка дыялектнай безэквівалентнай лексікі Брэсцкай вобласці [24]. Дацэнт Л. В. Леванцэвіч надрукавала курс лекцый «Лінгвістычнае краязнаўства Брэстчыны» (Брэст, 2013).

Прафесар І. А. Швед з'яўляецца аўтарам шэрага навуковых даследаванняў аб фальклоры Берасцейшчыны, вучэбна-метадычнага дапаможніка «Уводзіны ў фалькларыстыку» (Брэст, 2009–2010), вучэбнага дапаможніка і курса лекцый «Беларуская міфалогія» (Брэст, 2018–2019) і інш. Пад яе кіраўніцтвам дзейнічае вучэбная фальклорна-краязнаўчая лабараторыя. Нярэдка для студэнтаў філалагічнага факультэта, факультэта замежных моў праводзяцца фальклорна-краязнаўчыя святы «Ад прадзедаў спакон вякоў…» і іншыя мерапрыемствы.

У апошнія гады на філалагічным факультэце падрыхтаваны шэраг вучэбна-метадычных комплексаў краязнаўчай накіраванасці для магістрантаў і студэнтаў (у тым ліку электронных): «Методология лингвистических исследований» дацэнтаў С. А. Каралевіч і В. Б. Пераход (Брэст, 2020), «Анамастыка Брэстчыны ў кантэксце беларускай анамастыкі» дацэнта С. Ф. Бут-Гусаім (Брэст, 2021), «Фалькларыстыка» прафесара І. А. Швед і дацэнта І. В. Поўх (Брэст, 2022), «Беларуская тапаніміка і мікратапаніміка» дацэнта Н. Р. Якубук (Брэст, 2023), «Лінгвакультуралогія» дацэнта Л. В. Леванцэвіч (Брэст, 2025) і інш.

Вялікая ўвага краязнаўству надаецца на філалагічным факультэце падчас палявых вучэбных практык студэнтаў. Карысныя парады выкладзены ў вучэбна-метадычным дапаможніку «Студэнцкая фальклорная практыка» прафесара І. А. Швед (Брэст, 2007), метадычных рэкамендацыях па фальклорнай практыцы дацэнта Л. В. Скібіцкай (Брэст, 2014), па дыялекталагічнай практыцы дацэнта В. Б. Пераход (Брэст, 2014) і інш.

Сабраныя артэфакты матэрыяльнай і духоўнай спадчыны прадстаўлены ў музейнай экспазіцыі «Культура і побыт нашых продкаў». У рэестры фальклорных рукапісаў, аўдыя- і відэазапісаў ёсць матэрыялы, зафіксаваныя ў Брэсце, раёнах Брэсцкай вобласці, іншых рэгіёнах Беларусі, а таксама Расіі, Украіны, Польшчы. Жанравы архіў 1953–1985 гг. мае шырокую геаграфію: амаль усе вобласці Беларусі, Валынская і Харкаўская вобласці Украіны.

Там присутнічаюць малыя жанры фальклору, пазаабрадавая лірыка, сямейна-абрадавы фальклор, рытуальна-магічны фальклор, фальклорная проза, дзіцячы фальклор і інш. Гэты збор фальклорных матэрыялаў з'яўляецца каштоўнай крыніцай для разнастайных даследаванняў.

Для развіцця геаграфічнага, экалагічнага краязнаўства карыснымі будуць зборнікі, якія падрыхтавалі на філалагічным факультэце дацэнты У. А. Лебедзеў, Г. М. Праневіч, У. А. Сенькавец: «Зямля, прырода, людзі ў духоўнай культуры Беларусі» (Брэст, 1999), «Радаводнае дрэва Прыпяці» (Брэст, 2002), «Белавежская пушча ў духоўнай і культурнай спадчыне беларусаў» (Брэст, 2003).

У гонар прафесара У. А. Калесніка праводзіліся навуковыя канферэнцыі «Праблемы сучаснай беларусікі» (1997), «Берасцейска-Пінскае Палессе: мова, літаратура, гісторыя» (2002), рэгулярнымі сталі канферэнцыі «Калеснікаўскія чытанні». Выдадзена кніга ўспамінаў пра яго «Пасланец Праметэя» (Брэст, 2007) [25]. Ва ўніверсітэце прысуджаецца прэмія імя У. А. Калесніка ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук, заснавана стыпендыя яго імя, функцыянуе адукацыйна-асветны цэнтр імя У. Калесніка.

На філалагічным факультэце важнае значэнне надаецца ўшанаванню і іншых заслужаных выкладчыкаў. У прыватнасці, у гонар прафесара В. Я. Зарэцкай (Ляшук) падрыхтавана кніга «З людзьмі і для людзей» (Брэст, 2003), прафесара А. А. Майсейчыка – «Узыходжанне» (Брэст, 2011) і праводзілася канферэнцыя «Гісторыка-тэарэтычныя актуаліі сучаснай філалогіі» (2006). Памяці прафесара М. І. Мішчанчука прысвечана кніга «Жыццё пражыць…» (Брэст, 2010) і канферэнцыя «Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу» (2014). У гонар прафесара Г. М. Малажай падрыхтавана кніга «Святло сакавіцкага слова» (Брэст, 1998), праводзіліся канферэнцыі «Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі» (2008, 2013, 2018), навукова-метадычны семінар «Асоба Г. М. Малажай у беларускім мовазнаўстве» (2015). Дацэнту Я. А. Чарняўскай прысвечана кніга «Свет дабрыні» (Брэст, 2007) і «XII Горьковские чтения» (2014).

Шэраг выданняў быў прымеркаваны да юбілеяў філалагічнага факультэта і яго кафедраў. Кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі быў прысвечаны бібліяграфічны даведнік «З клопатам пра слова» (Брэст, 2004). Дацэнты Л. А. Гадуйка і А. Ю. Яніцкая пад кіраўніцтвам дацэнта В. Б. Пераход выдалі зборнік «Прикосновение к будущему» (Брэст, 2015), у якім змешчаны звесткі па гісторыі кафедры агульнага і рускага мовазнаўства, біяграфічныя матэрыялы, артыкулы, інтэрв'ю і інш. Пад рэдакцыяй А. Г. Ківака выдаваўся зборнік «Актуальные проблемы компаративистики» (Брэст, 2010), прысвечаны кафедры класічнай і сучаснай зарубежнай філалогіі.

**Гістарычнае краязнаўства**

Гісторыка-партыйная тэматыка прадвызначала змест навуковых даследаванняў па гісторыі на працягу шматлікіх дзесяцігоддзяў савецкага перыяду. Гэта адбілася і на краязнаўчай працы сярод студэнтаў. Напрыклад, у 1963 г. у тэматыку працы навуковых студэнцкіх гурткоў уключаліся пытанні аб новай праграме КПСС, пра матэрыялы XXII з'езда партыі, аб пабудове камуністычнага грамадства, камуністычным выхаванні, вучэбна-выхаваўчай дзейнасці ў школе. Сярод іншага гуртkоўцы праводзілі краязнаўчую працу, дзе значнае месца займала ваенная гісторыка-патрыятычная тэматыка [3, с. 77].

Ажыўленне гістарычнага краязнаўства пачалося ў 1985–1991 гг. Былі падрыхтаваны метадычныя парады для дапамогі краязнаўцам па комплексным вывучэнні населеных пунктаў, прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў (саўгасаў) (Брэст, 1988), адным з аўтараў якіх быў дацэнт Г. А. Вайндрах. Супрацоўнікі інстытута ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы выдання «Очерки истории Брестской областной парторганизации» (Мінск, 1989) і інш.

Сярод пачынальнікаў гістарычнага краязнаўства ва ўніверсітэце быў прафесар У. У. Мелішкевіч, які стаяў ля вытокаў адкрыцця ў 1991 г. гістарычнага факультэта. Дацэнты Н. П. Галімава, П. І. Гарбуль, А. А. Загорнаў, У. В. Здановіч, П. І. Корнеў, У. І. Нікіценкаў, П. С. Рамановіч, старшы выкладчык У. С. Спірын удзельнічалі ў пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі гісторыка-дакументальнай хронікі

«Памяць» г. Брэста [26], дзе змешчаны новыя крыніцы – архіўныя дакументы, перыёдыка, успаміны і інш. Прафесар І. І. Акінчыц, дацэнты У. В. Здановіч, А. М. Вабішчэвіч, М. Ф. Белавус, І. Э. Яленская, старшы выкладчык С. П. Жлоба ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы кніг «Памяць» па Пінскім, Столінскім раёнах, г. Пінску.

Пытанні рэлігійнага сінкрэтызму ў заходнепалескім рэгіёне вывучаў прафесар І. І. Акінчыц. Этнаграфічнымі даследаваннямі Заходняга Палесся займаўся старшы выкладчык С. П. Жлоба, аўтар кніг «Народная педагогіка Палесся» (Брэст, 2002), «Палявыя этнаграфічныя даследаванні» (разам з І. С. Чарнякевіч) (Брэст, 2013).

Асаблівую актуальнасць для ўніверсітэтазнаўства маюць працы па гісторыі БрДУ імя А. С. Пушкіна, прымеркаваныя да папярэдніх юбілеяў нашай ВНУ. Намаганнямі спецыялістаў гістарычнага факультэта былі падрыхтаваны асобныя навуковыя манаграфіі [3; 8], выйшлі бібліяграфічныя і біябібліяграфічныя даведнікі аб прафесарска-выкладчыцкім складзе [6; 10]. Таксама выдаваліся навуковыя зборнікі да юбілеяў гістарычнага факультэта, артыкулы аб кафедры гісторыі славянскіх народаў і інш.

Выкладчыкі (найперш доктар гістарычных навук А. А. Башкоў) і студэнты гістарычнага факультэта прымалі ўдзел у археалагічных даследаваннях значных аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Брэсцкай вобласці (палаца Сапегаў у Ружанах, палаца Пуслоўскіх у Косаве, сядзібы Нямцэвічаў у Скоках, Брэсцкай крэпасці і інш.), а таксама на месцах гарадскіх новабудоўляў. Некаторы вопыт гэтых даследаванняў быў абагульнены А. А. Башковым у манаграфіі «Шляхетские резиденции Брестчины в свете археологических исследований: Ружаны, Скоки, Коссово, Закозель» (Брэст, 2017; 2-е выд., дапоўн., 2022).

Вынікі даследаванняў на гістарычным факультэце прадстаўляюцца як у манаграфіях, так і на міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых канферэнцыях. Асобныя з іх – «Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае» (з 2003 г.; у 2004 г. была прысвечана памяці прафесара У. У. Мелішкевіча, 2018 г. – дацэнта У. І. Нікіценкава), «Праваслаўе ў духоўным жыцці Беларусі», «Фальклор, гісторыя і літаратура беларусаў у кантэксце культурнай спадчыны славян» (сумесна з філалагічным факультэтам), «Вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны Берасцейшчыны», «Нацысцкая палітыка генацыду на акупаваных тэрыторыях СССР», «1939 год у гістарычным лёсе беларускага народа» і інш. – сталі традыцыйнымі. Да 450-годдзя г. Століна была арганізавана міжнародная канферэнцыя «Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй» (2005). Праводзіўся рэспубліканскі навукова-метадычны семінар «Краязнаўчая праца ў адукацыйным працэсе: тэорыя і практыка рэалізацыі» (2023). Акрамя таго, былі заснаваны зборнікі навуковых прац «Берасцейскі хранограф», «Моладзь Берасцейшчыны» і інш.

На кафедры гісторыі славянскіх народаў выконваўся праект «Гарады і раёны Брэстчыны: гісторыя і сучаснасць», ініцыятарам якога быў прафесар А. А. Гарбацкі, па Івацэвіцкіму, Іванаўскім, Маларыцкім раёнах. Вынікам яго сталі адпаведныя калектыўныя манаграфіі.

Разнастайны архіўны матэрыял краязнаўчага характару ўтрымліваецца ў манаграфіі прафесара А. М. Вабішчэвіча «Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» (Брэст, 2008).

На кафедры ўсеагульнай гісторыі вывучалася мінулае Брэста міжваеннага часу, гісторыя яўрэйскіх абшчын Брэста, Пінска, гісторыя Халакосту ў заходніх абласцях Беларусі ў 1941–1944 гг. [27–29], створана база па вуснай гісторыі 1920–30-х гг. і інш. Сярод выдадзеных зборнікаў успамінаў – «“За польскім часам”... Западная Беларусь в воспоминаниях современников» (Брэст, 2019). Дацэнт Я. С. Разенблат прымаў непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў і матэрыялаў з фондаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, якія прысвечаны гісторыі Брэста ў 1919–1939, 1939–1941, 1941–1944, 1944–1953 гг. [30–33].

На кафедры гісторыі Беларусі прафесарам У. В. Здановічам, дацэнтам Т. П. Саўчук праводзіліся даследаванні аб мемарыялізацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі. Т. П. Саўчук у кандыдацкай дысертацыі [34] змясціла звесткі і пра мемарыялізацыю на тэрыторыі сучаснай Брэсцкай вобласці. Дацэнты Н. П. Галімава і П. І. Гарбуль распрацоўвалі спецкурс па гісторыі Брэста і інш.

Прафесары А. М. Вабішчэвіч, У. В. Здановіч, дацэнт А. А. Савіч з'яўляюцца суаўтарамі шматлікіх фундаментальных навуковых даследаванняў: «Гісторыя Беларусі» (у 6 т.), «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» (у 5 т.), «Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.» (у 2 кн.) і інш. Каштоўнай для краязнаўцаў з'яўляецца калектыўная манаграфія пра этнакультурныя працэсы Заходняга Палесся (Мінск, 2020), суаўтарамі якой з'яўляюцца прафесары А. М. Вабішчэвіч і І. А. Швед [35].

Цяпер на гістарычным факультэце краязнаўства вывучаецца разам з іншымі навуковымі напрамкамі ў межах дзеючых навуковых школ «Гісторыя, культура і рэлігія заходнебеларускіх зямель» (прафесар А. М. Вабішчэвіч), «Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа» (прафесар У. В. Здановіч). Гісторыка-краязнаўчай праблематыкай на кафедрах гістарычнага факультэта таксама займаюцца доктар гістарычных навук А. А. Башкоў, дацэнты А. А. Савіч, А. І. Пашковіч, Т. П. Саўчук, А. М. Свірыд, Н. В. Самасюк, А. Ю. Бодак, А. А. Бурык, Я. С. Разенблат, П. С. Рамановіч, Л. В. Лаўрэнка, А. Л. Дарковіч, В. У. Сушко, старшыя выкладчыкі В. Ю. Піліповіч, Я. Ю. Занько, выкладчык А. А. Селях і інш. У складанні біябібліяграфічных даведнікаў прымаюць удзел доктар гістарычных навук І. І. Шаўчук, дацэнт Л. П. Нікіценкава і інш.

Пры вывучэнні «Краязнаўства і этналогіі Беларусі» і іншых дысцыплін выкарыстоўваецца збор музейнай экспазіцыі. Для студэнтаў таксама распрацаваны рэкамендацыі па падрыхтоўцы, арганізацыі і правядзенні палявых этнаграфічных даследаванняў падчас вучэбных практык [36]. Падчас гісторыка-этнаграфічнай практыкі для студэнтаў наладжваюцца экскурсіі, майстар-класы (па генеалогіі і інш.), анлайн-канферэнцыі, выконваюцца індывідуальныя заданні. У прыватнасці, падчас гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнты гістарычнага факультэта завочнай формы навучання павінны выканаць наступныя заданні (на выбар): інтэрв'ю; краязнаўчае, этнаграфічнае апісанне аб'екта (населенага пункта, сядзібы, пабудовы, помніка і інш.); збор (экспанат); радавод (генеалагічнае даследаванне). Рэкамендавана запісаць інтэрв'ю з чалавекам – сведкам гістарычных падзей (заходнебеларускага перыяду 1921–1939 гг., перыяду 1939–1941 гг., перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. (ветэранамі вайны, вязнямі нацысцкіх лагераў, вывезенымі на прымусовую працу, і інш.), перыяду 1945–1953 гг. і інш. Гэта можа быць і запіс інтэрв'ю са старым чалавекам (карэнным жыхаром) пра этнаграфію і культуру Палесся (пэўнай мясцовасці): пра заняткі, промыслы і рамёствы, жыллё, адзенне, ежу, сям'ю і сямейны побыт, сямейную і каляндарную абраднасць, вераванні, міжнацыянальныя і міжканфесійныя адносіны. У ходзе практык ужо назапашаны пэўны збор каштоўных і арыгінальных матэрыялаў.

Тэматыка гістарычнага краязнаўства (гісторыя малых населеных пунктаў, гарадоў, раёнаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, помнікаў архітэктуры, этнаграфіі і фальклору, культуры і мастацтва Брэсцкай вобласці і інш.) актыўна распрацоўваецца ў курсавых і дыпломных працах, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацыях.

**Геаграфічнае і экалагічнае краязнаўства**

На факультэце прыродазнаўства працягваюцца традыцыі геаграфічнага, экалагічнага краязнаўства, закладзеныя яшчэ ў папярэднія дзесяцігоддзі. У 1950–70-я гг. студэнты прыродазнаўча-геаграфічнага факультэта нярэдка праходзілі палявыя практыкі ў Белавежскай пушчы. Пад кіраўніцтвам дацэнта М. Я. Аса студэнты рыхтавалі наглядныя вучэбныя дапаможнікі, апрацоўвалі сабраны матэрыял для заалагічнага музея. У студэнтаў прыродазнаўча-геаграфічнага і аграбіялагічнага факультэтаў практыка наладжвалася таксама ў Салігорску, на Бярозаўскім вапнавым заводзе, дзе яны знаёміліся з умовамі залягання, здабычы калійных солей, перапрацоўкай іх у мінеральныя ўгнаенні. У ходзе гэтай практыкі збіраўся матэрыял для геалагічнага кабінета і краязнаўчага кутка інстытута [3, с. 84]. Рэгулярна праводзіліся выязныя практыкі ў Карпаты, на Каўказ, у Крым і іншыя рэгіёны СССР.

Сярод пачынальнікаў экалагічнага краязнаўства быў прафесар В. Е. Гайдук, які актыўна вывучаў біялогію і экалогію пушных звяроў, вялікую ўвагу надаваў навукова-даследчай працы студэнтаў, узначальваў навуковы гурток «Экалогія». Эка-

лагічным краязнаўствам працягвалі займацца прафесар В. М. Яромін (аўтар шэрага падручнікаў па біялогіі і батаніцы), прафесар М. П. Жыгар, дацэнты А. Г. Бурдзін, А. М. Тарасюк, В. Т. Дзямянчык, Н. М. Матусевіч, Ю. Ф. Рой, С. Э. Кароза і іншыя выкладчыкі кафедры батанікі, кафедры батанікі і экалогіі.

Дасягненні спецыялістаў БДПІ імя А. С. Пушкіна ў галіне геаграфічнага краязнаўства былі прызнаны на агульнарэспубліканскім і ўсесаюзным узроўнях. Дацэнты Ф. В. Зяньковіч і М. У. Амельянчук у кнізе «Вывучэнне геаграфіі роднага краю» (Мінск, 1969) апісалі метады і прыёмы геаграфічнага краязнаўства.

Прафесар Я. М. Мяшэчка выдаў навучальны дапаможнік па геаграфічным краязнаўстве, які выкарыстоўваўся для спецыяльнасці «Геаграфія. Біялогія» ў педагагічных ВНУ краіны [37]. На кафедры геаграфіі былі падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі аб комплексным вывучэнні рэк і азёр (на прыкладзе Брэсцкай вобласці) для дапамогі краязнаўцам і арганізатарам турыстычнай працы ў школе (Брэст, 1989). Прафесар У. Я. Навуменка прымаў удзел у падрыхтоўцы гісторыка-эканамічнага нарыса г. Брэста [38].

На новы ўзровень геаграфічнае, экалагічнае краязнаўства ва ўніверсітэце выйшла ў 1990-я гг. – пачатку XXI ст. На працягу 1995–2021 гг. у структуры БрДУ імя А. С. Пушкіна функцыянавалі асобныя геаграфічны і біялагічны факультэты. Вялікую ролю ў разгортванні там навуковых даследаванняў, у т. л. па краязнаўстве, адыгралі навукова-педагагічныя школы. Біялагічная школа была прадстаўлена распрацоўкамі ў галіне батанікі (прафесары В. М. Яромін, М. П. Жыгар), заалогіі (прафесар В. Е. Гайдук), тэарэтычнай, арганічнай і медыцынскай хіміі, аграхіміі, экалогіі (прафесар М. П. Ярчак). На геаграфічным факультэце дзейнічала навукова-педагагічная школа па дэмаграфіі (прафесар К. К. Красоўскі), пачала складвацца школа па геалогіі (прафесар М. А. Багдасараў). Сярод цэлага шэрага напрамкаў навукова-даследчыцкай працы былі такія, як экалагічныя праблемы Беларускага Палесся, распрацоўкі ў галіне этнагеаграфіі і тапанімікі Брэсцкай вобласці, актуальныя рэгіянальныя праблемы дэмаграфіі, вывучэнне эканоміка-геаграфічных асаблівасцей развіцця прыгранічных тэрыторый і інш.

Прафесар Я. М. Мяшэчка выдаў вучэбны дапаможнік па геаграфічным краязнаўстве для геаграфічных спецыяльнасцей ВНУ, вучэбна-метадычны дапаможнік па краязнаўстве для студэнтаў геаграфічнага факультэта і слухачоў універсітэцкага Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, а таксама палявыя практыкумы па геаграфіі і геаграфічным краязнаўстве [39–42]. Прафесар Я. М. Мяшэчка, дацэнты М. У. Амельянчук, А. М. Краўчук былі аўтарамі вучэбнага дапаможніка «Геаграфія Беларусі» для вучняў 9 класа агульнаадукацыйнай школы з паглыбленым вывучэннем геаграфіі (Мінск, 1996; 2-е выд., дапоўн., 2001). Яны таксама падрыхтавалі дапаможнік для настаўнікаў «Геаграфія Брэсцкай вобласці» (Брэст, 1996).

Калектыў аўтараў (прафесар К. К. Красоўскі, дацэнт А. У. Грыбко, старшыя выкладчыкі В. К. Карпук, М. Л. Страха) пад рэдакцыяй дацэнта С. В. Арцёменкі падрыхтаваў дапаможнік «Геаграфія Брэсцкай вобласці» для геаграфічных спецыяльнасцей ВНУ (Брэст, 1999). У 2002 г. такі дапаможнік пад рэдакцыяй дацэнтаў С. В. Арцёменкі, А. У. Грыбко быў надрукаваны ў Мінску ў БДУ пад грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Атрыманыя веды і навыкі па біялагічных і геаграфічных дысцыплінах студэнты замацоўвалі падчас палявых практык на базе «Орхава» Брэсцкага раёна, на тэрыторыі біясфернага рэзервата «Прыбужскае Палессе», Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», заказнікаў «Спораўскі», «Сярэдняя Прыпяць», «Буслаўка» і інш.

Не толькі студэнты, але і школьнікі, настаўнікі праяўлялі цікаўнасць да біялагічнага музея, загадчыкам якога ў 1981–2006 гг. была Я. Б. Паплаўская. Там налічвалася больш за 2000 унікальных экспанатаў (ад выкапнёвых рэшткаў шарсцістага насарога і маманта да сучасных жывёл, птушак і рыб з асяроддзем іх пражывання ад марскога дна да запаведных лясоў і балот) [8, с. 42–43].

Для экалагічнага выхавання, краязнаўчай працы таксама выкарыстоўваліся магчымасці кабінета геалогіі. Там было больш за 1500 экзэмпляраў (сярод іх – мінералы, горныя пароды, закамянеласці), што назапасіліся на працягу дзесяцігоддзяў у

выніку руплівай збіральніцкай дзейнасці выкладчыкаў і студэнтаў. Геаграфія ўзораў калекцыйнага матэрыялу была дастаткова шырокай і разнастайнай: Расія (Карэлія, Каўказ, Забайкалле, Далёкі Усход і іншыя рэгіёны), Украіна, Казахстан, Бразілія і іншыя краіны [8, с. 43].

Біялагічны і геаграфічны факультэты выкарыстоўвалі магчымасці Цэнтра экалогіі (аграбіялагічны аддзел, «Зімовы сад», «Сад бесперапыннага цвіцення») для адукацыйнага працэсу і даследаванняў. У 2015 г. на тэрыторыі «Саду бесперарыўнага цвіцення» расло больш за 1600 экзэмпляраў каля 160 розных гатункаў дэкаратыўных дрэваў і кустоў, што прадстаўлялі флору многіх кантынентаў.

У экспазіцыйных залах «Зімовага саду», які быў адкрыты ў 2010 г., прадстаўлена расліннасць трох прыродных зон: вільготных экватарыяльных лясоў, субтропікаў, пустынь і паўпустынь (каля 2 тыс. экзэмпляраў). Каля 30 тыс. жыхароў Брэста і гасцей горада наведалі «Зімовы сад» на працягу першага года яго дзейнасці. І цяпер «Зімовы сад» з’яўляецца значнай пляцоўкай для экалагічнага краязнаўства сярод студэнцкай моладзі і школьнікаў.

Кафедры геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў удзельнічалі ў правядзенні цэлага шэрагу міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый па экалагічнай адукацыі і выхаванні, краязнаўстве і інш. Традыцыйнай на геаграфічным факультэце стала рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе школ і ВНУ», якая прысвячаецца памяці выкладчыкаў, ветэранаў працы: 2003 г. – дацэнту Ф. В. Зяньковічу, 2009 г. – дацэнту М. У. Амельянчуку, 2012 г. – прафесару У. Я. Навуменку, 2017 г. – дэкану факультэта Л. Я. Нямцовай, 2020 г. – дацэнту М. Л. Голуб, 2021 г. – дацэнту В. П. Сайгаку, 2023 г. – прафесару К. К. Красоўскаму, 2024 г. – дацэнту Л. Б. Навуменка.

У гонар выкладчыкаў праводзіўся шэраг іншых навуковых мерапрыемстваў, падрыхтаваны кнігі ці зборнікі. Прафесару А. А. Багдасараву прысвячалася бібліяграфічнае выданне (Брэст, 2015), праводзілася канферэнцыя «Актуальныя праблемы навук пра Зямлю: устойлівае развіццё гарадоў і рэгіёнаў» (2025). Прафесар В. Е. Гайдук ушаноўваўся навуковым семінарам «Заалагічныя чытанні» (2016) і асобнай кнігай пра яго «Гайдук Василий Емельянович: к 85-летию ученого и педагога» (Брэст, 2021).

Навуковыя канферэнцыі «Батанічныя чытанні» былі прысвечаны прафесарам В. М. Яроміну (2021) і М. П. Жыгар (2025). Шэраг артыкулаў па гісторыі факультэта прыродазнаўства, геаграфічнага факультэта, кафедры геаграфіі напісалі прафесар У. Я. Навуменка, дацэнт А. У. Грыбко і інш.

Цяпер праблематыка геаграфічнага краязнаўства, турызму актыўна распрацоўваецца прафесарска-выкладчыцкім складам факультэта прыродазнаўства. На кафедры гарадскога і рэгіянальнага развіцця вывучаюцца разнастайныя пытанні ўрбаністыкі. У краязнаўстве прымяняюцца тэхналогіі геаінфармацыйных сістэм, вэб-інвентарызацыя, картаграфаванне аб’ектаў гістарычнай памяці, ствараецца электронны прыродаахоўны атлас асобных мясцовасцей Брэстчыны і інш. (дацэнты С. М. Такарчук, А. В. Такарчук, выкладчык Г. М. Маеўская і інш.). Дацэнт С. А. Заруцкі і старшы выкладчык В. А. Мароз зрабілі інтэрактыўныя тэсты па дысцыпліне «Краязнаўства» (Брэст, 2021).

Пад рэдакцыяй дацэнта І. В. Абрамавай у 2023 г. была выдадзена калектыўная манаграфія, прысвечаная прыродзе, насельніцтву і эканоміцы Брэсцкай вобласці [43]. Сярод аўтараў яе матэрыялаў – член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар М. А. Багдасараў, дацэнты І. В. Абрамава, М. Ф. Грачанік, Т. А. Шэлест, А. І. Градунова, А. В. Такарчук, С. М. Такарчук, А. А. Сідаровіч, С. А. Заруцкі, А. Д. Панько, Т. С. Сілюк, старшыя выкладчыкі Н. І. Суханос, Д. А. Трафімчук, В. К. Карпук і інш.

Дацэнт В. Т. Дзямянчык і старшы выкладчык М. Р. Дзямянчык выдалі вучэбны дапаможнік па экспедыцыйнай практыцы для студэнтаў біялагічных і геаграфічных спецыяльнасцей ВНУ [44]. Яны таксама падрыхтавалі вучэбна-метадычны комплекс «Экалагічнае краязнаўства» (Брэст, 2013; 2017), які з’яўляецца карысным і для школьнікаў.

Разнастайныя аспекты геаграфічнага і экалагічнага краязнаўства (асаблівасці геалогіі, геамарфалогіі, клімату, гідралогіі, расліннага і жывёльнага свету Брэсцкай вобласці, яе эканоміка, прамысловасць, сельская гаспадарка, турызм і інш.) асвятля-

юцца студэнтамі пры напісанні курсавых і дыпломных прац, а таксама магістрантамі і аспірантамі ў ходзе напісання дысертацый. Прымяняюцца як традыцыйныя, так і наватарскія метады (картаграфаванне, SWOT-аналіз і інш.). Краязнаўчыя працы, праекты навучэнцаў пад кіраўніцтвам выкладчыкаў факультэта прыродазнаўства (асабліва дацэнтаў С. М. Такарчук, А. В. Такарчука і інш.) высока ацэньваюцца на Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў.

**Стан краязнаўства на асобных факультэтах. Краязнаўства ва ўніверсітэце на сучасным этапе**

Немалыя дасягненні ў галіне краязнаўства мае факультэт педагогікі і псіхалогіі. Гэта вынік плённай працы на працягу многіх дзесяцігоддзяў прафесарска-выкладчыцкага складу сацыяльна-педагагічнага і псіхолага-педагагічнага факультэтаў, дзе сфарміраваліся навукова-педагагічныя школы па педагогіцы (прафесары М. П. Осіпава, Г. М. Сендзер, М. А. Дабрынін).

На сацыяльна-педагагічным факультэце была распрацавана навукова-метадычная база і назапашаны вопыт па экалагічным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту. Менавіта там была створана экалагічная лабараторыя, якая была пераўтворана ў міжфакультэцкі вучэбна-метадычны і навукова-даследчыцкі цэнтр экалогіі і прыродазнаўства пад кіраўніцтвам В. М. Верамчук. Дацэнт Г. М. Казаручык падрыхтавала дапаможнік для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі «Экологическое воспитание детей дошкольного возраста» (Мінск, 2014). Дацэнт Т. Л. Гарнастай, якая вывучае пытанні народнай педагогікі, дашкольнага экалагічнага краязнаўства, выдала вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў «Теоретические основы экологического воспитания детей дошкольного возраста» (Брэст, 2023).

